З каталіцкіх СМІ Беларусі (30)

Аўтар: Рэдакцыя
29.05.2022 00:00

На поўдні Бразіліі, у штаце Рыу-Грандзі-ду-Сул, была ўзведзена адна з найбольшых у свеце статуй Хрыста.

Фігура Хрыста Абаронцы ў горадзе Энкантаду мае вышыню 43,5 метры, што на 5,5 метраў вышэй за славутую статую Хрыста ў Рыа-дэ-Жанэйра.

Аўтарамі скульптуры сталі бразільскія архітэктары Жэнэзіу Гомэш Мура і яго сын Маркаш Мура. Плануецца, што ўсе ўнутраныя працы на помніку будуць завершаны да 2023 года. На ім будзе размешчана аглядная пляцоўка ў акне, зробленым у выглядзе Сэрца Езуса.

На сёння самай вялікай статуяй Хрыста лічыцца Хрыстос Валадар у Свебодзіне (Польшча). Гэты помнік мае вышыню 36 метраў: 33 метры складае фігура Хрыста і яшчэ 3 метры – залатая карона на Яго галаве. Помнік узвышаецца на кургане вышынёй 16,5 метраў, і разам з гэтым п'едэсталам вышыня статуі дасягае рэкордных 52,5 метраў.

Вікторыя Радзюкевіч з Беларусі праходзіць фармацыю ў сясцёр салезіянак у Рыме. Дзяўчына прызнаецца, што ніколі не мела жадання пайсці ў кляштар, але адказала Богу на тое, што ўбачыла праз малітву – знакі, штодзённасць, а таксама праз намер і жаданне сэрца сапраўды споўніць волю Айца. "Самы першы крок зрабіў да мяне Бог, калі даў вялікае жаданне маліцца адной малітваю пад назвай «Адданне сябе Богу», у якой гаварыла: «…Дай мне толькі Тваю любоў і ласку, і буду я дастаткова багатая і нічога больш шукаць не буду»", – дзеліцца Вікторыя.

У Італіі дзяўчына адзначае адмысловы спосаб гаварыць і выказвацца з жэстамі. Таксама заўважае больш радасці, прастаты і лёгкасці ў штодзённасці. Вікторыя жыве з чатырма іншымі аспіранткамі: трыма з Італіі і адной з Албаніі. Акрамя духоўных практык, яны разам падарожнічаюць, збіраюцца за настольнымі гульнямі.

Аўтар: Рэдакцыя
29.05.2022 00:00